POLITICAL SPHERE

BELARUS BEEHIVE

Інстытут палітычных даследаванняў

«Палітычная сфера»

# Беларускія студэнты ў Еўропе

*Колькасць. Краіны. Дынаміка.*

*Лізавета Пракопчык*

Для беларускіх студэнтаў у Беларусі ствараецца ўсё больш перашкод. Таму відавочна, што колькасць беларускіх студэнтаў у замежжы толькі павялічваецца, у прыватнасці ў Еўропе.

У Беларусі колькасць студэнтаў з кожным годам змяншаецца. За апошнія дзесяць гадоў колькасць студэнтаў у Беларусі скарацілася на 41%[1][2].

Пры гэтым колькасць беларускіх студэнтаў у Еўропе расце. З 2014/2015 па 2020/2021 навучальныя гады іх агульная колькасць павялічылася на 79%.

Актуальнасць даследавання колькасці беларускіх студэнтаў у Еўропе звязана не толькі з глабальнымі тэндэнцыямі ў сферы адукацыі, але і з канкрэтнымі сацыяльна-палітычнымі і эканамічнымі выклікамі, з якімі сутыкаюцца грамадзяне Беларусі. Змены ў адукацыйнай палітыцы: пагрозы павелічэння тэрміну размеркавання, адмена магчымасці навучацца за асабістыя сродкі на некаторых спецыяльнасцях, а таксама палітычны і эканамічны ціск спрыяюць змяненню патокаў беларускіх студэнтаў, якія ўсё часцей абіраюць замежныя вучэбныя ўстановы для працягу навучання. Гэтае даследаванне мае на мэце вывучыць дынаміку змянення колькасці беларускіх студэнтаў у Еўропе з 2014/2015 па 2020/2021 навучальныя гады.

[1] https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/5d6/5d62c11490270d88d396c8788f28b95d.pdf

[2] https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/b38/b38b23677fdba6313942d69b1434f89c.pdf

Статыстыка адлюстроўвае значныя змены ў колькасці студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю за мяжой, асабліва ў святле таго, што за апошнія дзесяць гадоў колькасць студэнтаў у Беларусі скарацілася на 41%. Аналіз гэтых даных дапаможа зразумець, якія краіны Еўропы аказваюцца найбольш прывабнымі для беларускіх студэнтаў.

Такім чынам, даследаванне з'яўляецца важным крокам у разуменні глабальных адукацыйных тэндэнцый і спецыфікі міграцыі беларускіх студэнтаў, а таксама ў вызначэнні палітыкі і стратэгій, неабходных для падтрымкі і адаптацыі гэтых студэнтаў у новым адукацыйным асяроддзі.

## Метадалогія

Метадалогія даследавання колькасці беларускіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Еўропе, абапіраецца на комплексны падыход да збору і аналізу даных. Для атрымання найбольш поўнай інфармацыі даследаванне базуецца на двух асноўных крыніцах даных.

Першая крыніца - гэта адкрытыя крыніцы інфармацыі, уключаючы старонкі нацыянальных статыстычных агенцтваў краін Еўропы і іх адкрытыя базы даных. Таксама выкарыстоўваліся базы даных іншых спецыялізаваных рэсурсаў, такіх як Organization for Economic Cooperation and Development (OECD).

Другая крыніца даных заключаецца ў прамым кантакце з нацыянальнымі статыстычнымі агенцтвамі і іншымі дзяржаўнымі органамі краін Еўропы. У выпадках, калі адкрытыя базы даных не маюць патрэбнай інфармацыі або яна недаступная, была ініцыявана камунікацыя непасрэдна з супрацоўнікамі гэтых арганізацый.

У даследаванне ўлічваліся студэнты, якія вучацца на бакалаўрскіх, магістарскіх і доктарскіх праграмах на вочнай форме навучання. У выпадку Расіі ўлічваліся яшчэ і студэнты, якія праходзяць навучанне па праграмах спецыялітэту.

## Колькасць беларускіх студэнтаў

Па стане на навучальны год 2021/2022, колькасць студэнтаў, якія здабываюць адукацыю па ўсёй Еўропе, склала каля 115 мільёнаў чалавек. Сярод агульнай колькасці студэнтаў, доля тых, хто паходзіць з Беларусі, склала 0,014%. На першы погляд, такі працэнт можа паказацца даволі сціплым. Але, праводзячы паралелі з данымі 2013/2014 навучальнага года,

калі беларускія студэнты складалі ўсяго 0,008%, становіцца відавочным значны рост іх прысутнасці ў еўрапейскім адукацыйным прасторы.

Гэтае павелічэнне асабліва значнае на фоне таго, што за гэты ж перыяд агульная колькасць студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Еўропе, таксама павялічылася на 5 мільёнаў чалавек.




Агулам студэнтаў замяжой, пачынаючы з 2017/2018 навучальнага году становіцца больш. Сярэднегадавы рост колькасці беларускага студэнцтва ў замежжы  з 2017/2018 па 2020/2021 навучальны год склаў 5%. У 2021/2022 годзе у замежжы навучалася каля 25.000 студэнтаў з Беларусі, пры гэтым 82% ад гэтай колькасці навучаліся ў Польшчы і Расіі. Увесь час назірання ў сярэднім у гэтых дзвюх краінах навучалася 81% ад усіх беларускіх студэнтаў у замежжы.

Агляд даных апошніх гадоў адлюстроўвае стабільнае павелічэнне колькасці беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю за межамі роднай краіны. Аналіз перыяду з 2017/2018 па 2020/2021 навучальныя гады выяўляе сярэднегадавы рост на ўзроўні 5%. Да 2021/2022 навучальнага года колькасць беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю за мяжой, дасягнула прыкладна 25 000 асоб.

Значная большасць беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю за мяжой, засяроджаныя ў двух канкрэтных краінах: Польшчы і Расіі, іх доля ад агульная колькасці беларускіх студэнтаў за мяжой у перыяд з 2019-2021 год складае 82%. Гэтая схільнасць захоўвалася на працягу ўсяго аналітычнага перыяду. Беларускія студэнты дзвюм дзяржавам было

зафіксавана ў 2013/2014 навучальным годзе, калі 85% беларусаў, якія навучаліся за мяжой, выбралі менавіта іх для свайго навучання. Найменшая, але ўсё ж высокая, канцэнтрацыя беларускіх студэнтаў у Польшчы і Расіі назіралася ў перыяд з 2016 па 2018 гады, складаючы 78%.




У той жа час колькасць студэнтаў у Беларусі з года ў год змяншаецца. З 2013/2014 па 2022/2023 навучальныя гады колькасць студэнтаў у Беларусі скарацілася на 167,3 тыс. чалавек. І толькі ў 2022/2023 навучальным годзе колькасць студэнтаў павялічылася на 2% у параўнанні з папярэднім навучальным годам. Пазітыўная дынаміка ў колькасці студэнцкага насельніцтва Беларусі назіраецца ўпершыню за дзесяць гадоў.

Гэты рост, праўда, хутчэй звязаны з ростам цікаўнасці беларускай адукацыяй не з боку мясцовых студэнтаў, а замежных. У 2023/2024 годзе ў Беларусі навучалася прыкладна 28.500 замежных студэнтаў[3]. Калі параўноўваць з папярэднім навучальным годам, то гэтая лічба, таксама адзначаецца значным ростам — 39% (у 2022/2023 годзе у Беларусі навучалася каля 20500 замежных студэнтаў[4]).

Сярод еўрапейскіх дзяржаў, якія асабліва прываблівають беларускіх студэнтаў, вылучаюцца такія краіны як Польшча, Нямеччына, Чэхія і Літва.

[3] https://sputnik.by/20240123/pochti-30-tysyach-inostrantsev-obuchaetsya-v-vuzakh-belarusi-1083008983.html

[4] https://studyinby.com/education-in-belarus/belarusian-education-in-figures/

Нягледзячы на тое, што Нямеччына і Літва займаюць пазіцыі лідараў у тым, колькі беларускіх студэнтаў атрымлівае там адукацыю, да навучальнага года 2020/2021 было зафіксавана зніжэнне колькасці студэнтаў з Беларусі ў гэтых краінах, але пачынаючы з гэтага года назіраецца пазітыўная дынаміка, асабліва ў Літве. У перыяд з 2020/2021 па 2023/2024 іх колькасць вырасла на 65%.

З іншага боку, ёсць краіны ў Еўропе, якія не карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод беларускіх абітурыентаў. Да іх адносяцца Ісландыя, Ірландыя, Люксембург, Харватыя і Румынія, у кожнай з гэтых краін колькасць беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю, не перавышае 10 асоб.

Устойлівым ростам попыту адзначаюцца Чэхія, Польшча і Славакія — у гэтых краінах колькасць беларускіх студэнтаў не зніжалася ніводнага разу на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Пры чым у Славакіі з 2016/2017 па 2021/2022 навучальныя гады колькасць студэнтаў з Беларусі павялічылася амаль у 7 разоў (з 17 чалавек да 118 чалавек).

У Нідэрландах колькасць беларускіх студэнтаў паменшылася толькі аднойчы — у 2017/2018 годзе, але з таго моманту толькі расла. На момант 2023/2024 навучальнага году ў Нідэрландах навучалася 110 чалавек, у параўнанні з 2017/2018 годам назіраецца рост у 2,2 разы.

Таксама попытам карыстаюцца і Аўстрыя, Бельгія, Фінляндыя. Гэтыя краіны карысталіся няўстойлівым попытам сярод беларускіх студэнтаў, але ў кожнай з іх можна таксама адзначыць рост, пачынаючы з 2020/2021 году.

Краінай, дзе адбылося зніжэнне цікаўнасці з боку беларускіх студэнтаў, з'яўляецца Італія. У 2014/2015 навучальным годзе там атрымлівалі вышэйшую адукацыю 492 беларуса. Але ўжо ў  годзе студэнтамі там з'яўляліся толькі 231 чалавекі з беларускім грамадзянства. Асноўнае падзенне адбылося паміж 2018/2019 і 2019/2020 навучальнымі гадамі. У 2018/2019 годзе колькасць беларускіх студэнтаў складала 511 чалавек, а ў наступным навучальным годзе іх засталося толькі 200.

Акрамя гэтага ўстойлівыя адмоўныя тэндэнцыі па колькасці беларускіх студэнтаў назіраюцца таксама ў Харватыі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Швецыі, Нарвегіі, Люксембургу, Венгрыі, Францыі і Даніі.

## Беларускія студэнты ў Польшчы

Калі разгледзець дынаміку колькасці беларускіх студэнтаў, якія навучаюцца ў вышэйшых навучальных установах Еўропы, можна заўважыць, што асаблівае месца ў гэтым кантэксце займае Польшча, якая, паводле даступных даных, стала асноўным напрамкам для беларускіх студэнтаў за апошнія гады. [5]




На 2021 год у польскіх вышэйшых навучальных установах адукацыю атрымлівала прыкладна 12 млн. студэнтаў. Сярод іх колькасць беларускіх студэнтаў дасягнула 11 075, што складае каля 0,91%.

Акрамя таго, калі разглядаць долю беларускіх студэнтаў сярод усіх замежных студэнтаў, якія вучацца ў Польшчы, то яна складае 12,37%, што сведчыць аб значнай заўважнай долі беларускага студэнцтва. Нягледзячы на гэта, беларусы значна адстаюць ад украінскіх студэнтаў. Яны складаюць 40,27% сярод усіх замежных студэнтаў у Польшчы.

Аналіз дынамікі за перыяд з 2013/2014 па 2021/2022 навучальныя гады паказвае, што колькасць беларускіх студэнтаў у Польшчы павялічылася больш чым на 7 тыс. чалавек. Гэты рост быў даволі выразным яшчэ ў перыяд да падзей 2020 года, што сведчыць аб пастаянным і стабільным павышэнні прывабнасці польскіх адукацыйных устаноў для беларусаў.

Сістэматычнае павелічэнне колькасці беларускіх студэнтаў у Польшчы кожны год прыкладна на 500 чалавек дэманструе стабільны інтарэс да

[5] Колькасць беларускіх студэнтаў за 2022/2023 навучальны год узята па стане на 31 снежня 2022 года.

атрымання адукацыі ў гэтай краіне. Асабліва ўвагу прыцягвае факт, што ў 2017/2018 навучальным годзе колькасць беларускіх студэнтаў склала 6 004 чалавекі, а ўжо ў наступным 2018/2019 навучальным годзе гэтая лічба павялічылася да 7 314 студэнтаў. Такі рост цікаўнасці беларускіх студэнтаў у вышэйшых адукацыйных установах Польшчы хутчэй за ўсё звязаны са зменамі ў заканадаўстве, якія дазволілі ўсім іншаземцам навучацца ў Польшчы бясплатна, калі яны валодаюць польскай мовай на ўзроўні C1[6].

У наступныя гады гэты трэнд захоўваўся, і колькасць беларускіх студэнтаў у Польшчы кожны год павялічвалася як мінімум на 1 тыс. чалавек.

Апошнія даступныя звесткі аб становішчы беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Польшчы, абмяжоўваюцца 2021/2022 навучальным годам. Гэтыя абставіны замінаюць аб'ектыўна ацэніць апошнія змены ў асноўных тэндэнцыях сярод беларускіх студэнтаў. Тым не менш, заслугоўвае ўвагі факт, што ў 2020/2021 навучальным годзе назіралася паскарэнне тэмпу росту колькасці беларускіх студэнтаў у Польшчы. Гэтая тэндэнцыя працягнулася і ў наступным навучальным годзе, калі колькасць беларускіх студэнтаў павялічылася больш чым на 1,3 тыс. чалавек за абодва навучальныя гады.

## Беларускія студэнты ў Чэхіі

Чэхія з'яўляецца яшчэ адной краінай, дзе заўсёды назіралася пастаяннае павелічэнне колькасці беларускіх студэнтаў.

Па стане на навучальны год 2021/2022 у Чэхіі навучалася 2,1 млн. студэнтаў, з якіх беларусы складалі 0,044%. Гэты паказчык значна вырас у параўнанні з 2013/2014 навучальным годам, калі доля беларускіх студэнтаў у Чэхіі складала ўсяго 0,027%. Такім чынам, за аналізаваны перыяд можна заўважыць амаль двайное павелічэнне прысутнасці беларускага студэнцтва ў Чэхіі, што адлюстроўвае агульнаеўрапейскі трэнд.

З 2013/2014 па 2021/2022 навучальны год колькасць беларускіх студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Чэхіі, вырасла на 65%, дасягнуўшы адзнакі з 577 да 949 чалавек.[7] Адным з ключавых фактараў, які спрыяе такому росту, з'яўляецца магчымасць бясплатнага навучання на чэшскай мове, што робіць Чэхію прывабнай для міжнародных студэнтаў, у тым ліку з Беларусі.

---

[6] https://www.gov.pl/web/nauka/na-jakich-zasadach-cudzoziemcy-podejmuja-i-odbywaja-nauki-w-polskich-szkolach-wyzszych

[7] https://stats.oecd.org/Index.aspx?DataSetCode=EDU_ENRL_MOBILE#




Аднак, варта заўважыць, што пасля пачатку паўнамаштабнага канфлікту ў Украіне, Чэхія ўвяла абмежаванні для беларускіх студэнтаў, якія тычацца магчымасці навучання на большасці тэхнічных спецыяльнасцяў[8]. Гэтае рашэнне можа ўплываць на далейшыя тэндэнцыі ў колькасці беларускіх студэнтаў, якія выбіраюць Чэхію для атрымання вышэйшай адукацыі.

Такім чынам, нягледзячы на выклікі, Чэхія застаецца важным і прывабным напрамкам для беларускіх студэнтаў, якія імкнуцца атрымаць еўрапейскую адукацыю.

## Беларускія студэнты ў Літве

Літва заўсёды была адным з цэнтраў беларускай эміграцыі. За прааналізаваны перыяд колькасць беларусаў, якія абіралі Літву для часовага альбо пастаяннага месца пражывання павялічвалася. Але колькасць беларускіх студэнты ў той жа час толькі змяншалася.

Колькасць беларускага студэнцтва ў Літве, пачынаючы з 2013/2014 навучальнага года, выяўляюць унікальную дынаміку. У аналізаваны першапачатковы перыяд, лік студэнтаў дасягнуў свайго піку — 1682 асобы і гэта быў максімум цікаўнасці літоўскай адкацыяй з боку беларускіх студэнтаў.

[8] https://www.educationcenter.cz/blog/ogranicheniya-dlya-studentov-iz-rossii-i-belarusi-v-vuzah-chehii/

Працягваючы аналіз, можна заўважыць, што ў наступныя гады пачалося зніжэнне колькасці беларускіх студэнтаў, якое не было раптоўным, а паказвала паступовую тэндэнцыю да спаду. Гэтае зніжэнне дайшло да свайго апагею ў 2018/2019 навучальным годзе, калі колькасць студэнтаў упала да прыкладна 1 тыс. Гэты спад магчыма быў выкліканы знешнімі фактарамі, такімі як змяненне адукацыйнай палітыкі ў Літве або Беларусі, а таксама эканамічнымі ці сацыяльнымі выклікамі, якія ўплываюць на беларускіх студэнтаў.

Аднак, пасля пазначанага перыяду назіраецца ўстойлівае павелічэнне, якое працягваецца і ў наступных гадах. Гэтая пазітыўная дынаміка магла быць спрыяна рознымі ініцыятывамі, напрыклад, павелічэннем колькасці стыпендыяльных праграм для беларусаў, паляпшэннем умоў навучання або павышэннем якасці адукацыі ў літоўскіх універсітэтах.

У 2020/2021 і 2021/2022 навучальных гадах назіраецца аднаўленне колькасці беларускіх студэнтаў, што магло адбыцца на фоне палітычных змяненняў у Беларусі, якія спрыялі пошуку новых магчымасцяў для навучання і асабістага росту.

Да 2023/2024 навучальнага года, колькасць студэнтаў павялічылася да 1618, што мала адрозніваецца ад лічбаў, зафіксаваных на пачатку аналізаванага перыяду.




Нягледзячы на агульнае памяншэнне, у апошнія навучальныя гады беларусы захавалі статус адной з самых масавых груп сярод замежных студэнтаў у Літве, налічваючы 1613 асоб. Лідзіраваць беларусы перасталі толькі пасля пачатку шырокамаштабнай ваенных дзеянняў Расіі супраць Украіны ў 2022 годзе, калі былі рэалізаваныя праграмы дапамогі ўкраінскім

студэнтам. Іх колькасць узрасла з 647 у 2021/2022 да 1808 у наступным годзе, перавысіўшы колькасць беларускіх студэнтаў, якія склалі 1444.

Большасць беларускіх студэнтаў аддае перавагу ЕГУ, дзе ў 2022/2023 навучаецца 953 асобы або 69,9% ад іх агульнай колькасці. Гэта можна павязаць з тым, што шмат праграм ЕГУ дасяжныя на расійскай мове. Тым не менш, значнасць іншых універсітэтаў Літвы ўзрасла пасля палітычнага крызісу ў Беларусі, асабліва дзякуючы прыцягненню мэтавых стыпендый. Калі ў апошнія 10 гадоў у сярэднім у іх навучалася блізу 220 беларусаў, то ў 2020/2021 гэтая лічба павялічылася да 363, а ў 2022/2023 — да 411.[9]

**Беларускія студэнты ў Нямеччыне**

У Нямеччыне сітуацыя з колькасцю беларускіх студэнтаў развіваецца па сцэнарыі, надзвычай блізкаму да таго, што адбываецца ў Літве. Да навучальнага года 2020/2021 назіралася выразнае скарачэнне колькасці навучэнцаў з Беларусі, якія атрымліваюць адукацыю ў гэтай краіне. Калі ў 2013/2014 годзе ў Германіі вучылася 1713 студэнтаў з Беларусі, то да 2019/2020 года іх колькасць знізілася да мінімальнага паказчыка ў 1063 асобы[10].




[9] Падрабязней пра студэнтаў з Беларусі ў Літве гл.: Собирая факты: миграция из Беларуси в Литву до и после кризиса 2020 года https://palityka.org/wp-content/uploads/2023/03/Migration_Report_LT_2023-1.pdf

[10] Organisation for Economic Cooperation and Development

Аднак, пачынаючы з 2020/2021 навучальнага года, было зафіксавана аднаўленне колькасці беларускіх студэнтаў, і гэты пазітыўны трэнд захаваўся і ў наступным 2021/2022 навучальным годзе. Варта адзначыць, што рост адбываецца даволі павольна: калі ў 2020/2021 годзе павелічэнне склала 5%, то ў 2021/2022 годзе — усяго 1%.

Нягледзячы на тое, што агульная колькасць замежных студэнтаў у Германіі пастаянна расце, беларускія студэнты займаюць даволі сціплую частку ў структуры нямецкай вышэйшай адукацыі. У 2021/2022 навучальным годзе ў Нямеччыне адукацыю атрымлівалі каля 350тыс. замежных студэнтаў, пры гэтым беларусы склалі ўсяго 0,32% ад іх агульнай колькасці.

**Беларускія студэнты ў Расіі**

Калі глядзець лічбы ў абсалютным значэнні, то Расія заўсёды была ў лідарах па прывабнасці для беларусаў, якія прагнуць атрымаць вышэйшую адукацыю.

У 2023/2024 годзе адносная колькасць беларускіх студэнтаў у Расіі склала 1,3% ад усёй колькасці студэнтаў, якія навучаюцца ў Расійскай Федэрацыі. Гэта робіць Расію самай вялікай краінай па шчыльнасці беларускіх студэнтаў пасля Беларусі.

Але дынаміка была агульная дынаміка адмоўная. У 2013/2014 годзе ў Расіі навучалася 25 055 беларусаў, але ўжо ў 2023/2024 годзе беларускіх студэнтаў засталося толькі 11 875.

Па стане на 2021/2022 навучальны год Польшча абганяла Расію па колькасці беларускіх студэнтаў (11075 беларускіх студэнтаў у Польшчы супраць 10509 у Расіі). Але спрашчэнне сістэмы паступлення ў расійскія вузы для студэнтаў з Беларусі ўвесну 2021 года[11] можа гэта змяніць.

Са спрашчэннем сістэмы паступлення можна і павязаць змены тэмпу росту колькасці беларускіх студэнтаў у Расіі, пачынаючы як раз з 2021/2022 навучальнага году. З 2021/2022 па 2023/2024 навучальныя гады ўпершыню назіраўся ўстойлівы рост колькасці студэнтаў з Беларусі. Дагэтуль рост адбываўся толькі аднойчы — у 2019/2020 годзе.

Нягледзячы на памяншэнне колькасці беларускіх студэнтаў агулам, узрастае колькасць беларускіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Расіі па міжнародных дамовах. У 2013/2014 годзе па такіх дамовах навучалася ўсяго 260 чалавек. У 2023/2024 годзе іх стала ўжо 2624.

[11] https://www.minobrnauki.gov.ru/upload/iblock/912/912b7b4cabb2d9b433cbf7e1738856d3.pdf

Хоць студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Еўропе, застаецца больш, чым тых, хто навучаецца ў Расіі, захаванне цяперашняга трэнду можа прывесці да істотных змен у найбліжэйшай будучыні.

## Асноўныя вынікі

Асноўныя вынікі гэтага даследавання адлюстроўваюць значныя змены ў патоках беларускіх студэнтаў, якія аддаюць перавагу замежным установам вышэйшай адукацыі ў пошуках якаснай адукацыі і стабільнасці.

**Павелічэнне колькасці беларускіх студэнтаў за мяжой:** Назіраецца стабільны рост колькасці беларускіх студэнтаў, якія выбіраюць для навучання Еўропу. Гэта сведчыць аб пашырэнні геаграфіі інтарэсаў беларускай моладзі ў галіне адукацыі, а таксама аб пошуку лепшых магчымасцяў для атрымання вышэйшай адукацыі.

**Зніжэнне колькасці студэнтаў у Беларусі:** Паралельна назіраецца зніжэнне колькасці студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў самой Беларусі. Гэта магчыма звязана з ускладненнем умоў атрымання адукацыі ў краіне і пашырэннем магчымасцяў за яе межамі.

**Польшча як лідар сярод краін Еўропы:** Польшча вылучаецца як асноўны напрамак для беларускіх студэнтаў, дзе назіраецца найбольшы прырост колькасці беларускіх студэнтаў. Прычыны гэтага — геаграфічная блізкасць, высокі ўзровень адукацыі і культурныя сувязі.

**Зніжэнне інтарэсу да некаторых краін:** Адначасова некаторыя краіны Еўропы, такія як Італія, Літва і Латвія, паказалі зніжэнне колькасці беларускіх студэнтаў, што можа быць абумоўлена зменамі ў адукацыйнай палітыцы ці ўмовамі навучання.

**Рост у Расіі і змены ў структуры паступлення:** У Расіі таксама назіралася павелічэнне колькасці беларускіх студэнтаў, асабліва пасля спрашчэння сістэмы паступлення. Гэта паказвае змяненне патокаў міграцыі студэнтаў у адказ на палітычныя і эканамічныя змены ў рэгіёне.

Вынікі даследавання паказваюць, што беларускія студэнты актыўна шукаюць магчымасці для атрымання якаснай адукацыі за мяжой, пры гэтым аддаючы перавагу краінам з блізкай культурнай сферай, высокім узроўнем адукацыйных паслуг і ліберальнымі ўмовамі для замежных студэнтаў.